# «ДОЛГИЙ XIX ВЕК» В ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ: ИССЛЕДОВАНИЯ ПО НОВОЙ И НОВЕЙШЕЙ ИСТОРИИ



ВЫПУСК 3

Государственное учреждение образования
«Республиканский институт высшей школы»

# «ДОЛГИЙ XIX ВЕК» В ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ: ИССЛЕДОВАНИЯ ПО НОВОЙ И НОВЕЙШЕЙ ИСТОРИИ

Сборник научных трудов

Выпуск 3

Минск
РИВШ
2019

УДК 94(47/49)«18»(082)
ББК 63.3(45)6я43
Д64

Сборник основан в 2017 г.

Рекомендовано
редакционно-издательской комиссией
ГУО «Республиканский институт высшей школы»
(протокол № 6 от 26 декабря 2018 г.)

Редакционная коллегия:
чл.-кор. НАН Беларуси, д-р ист. наук, проф. *И. А. Марзалюк* (пред.);
канд. ист. наук, доц. *С. Ф. Шимукович* (отв. за выпуск);
д-р ист. наук, проф. *В. А. Космач*;
д-р ист. наук, проф. *В. С. Кошелев*;
д-р ист. наук, проф. *Г. Г. Лазько*;
д-р ист. наук, проф. *А. М. Лютый*;
д-р истории *О. Мастяница-Станкевич* (Литва, Вильнюс);
д-р ист. наук, проф. *С. И. Никонова* (Россия, Казань);
д-р ист. наук, проф. *И. Р. Чикалова*;
д-р ист. наук, проф. *В. И. Яковчук*;
канд. ист. наук, доц. *В. А. Сосно*;
канд. ист. наук, доц. *В. А Теплова*

Д64 «**Долгий** XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. Вып. 3 / редкол.: И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2019. – 246 с.
ISBN 978-985-586-324-4.

Сборник научных трудов издается в рамках выполнения задания 1.1.03 «История и культура» подзадания 1.1.03.3 «Формирование элит на территории Беларуси в XIX – начале XX века» (номер госрегистрации 20160828) государственной программы научных исследований «Экономика и гуманитарное развитие белорусского общества» на 2016–2020 гг. Содержит научные статьи, в которых ученые-историки Беларуси, России, Украины и Литвы рассматривают разные аспекты развития Восточной Европы и территории современной Беларуси в интересный, насыщенный событиями исторический период, обозначенный Э. Хобсбаумом как «долгий XIX век».

Адресован профессиональным и начинающим исследователям, преподавателям, студентам и всем, кто интересуется историей нового времени Беларуси.

**УДК 94(47/49)«18»(082)**
**ББК 63.3(45)6я43**

**ISBN 978-985-586-324-4**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2019

pawet.net

# СОДЕРЖАНИЕ

**РАЗДЕЛ 1. ИСТОЧНИКИ И ИСТОРИОГРАФИЯ ИСТОРИИ ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ «ДОЛГОГО XIX ВЕКА»** ............3

*Матвейчык Д. Ч.* Палкавыя гісторыі як гістарыяграфічная з'ява ў даследаванні паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі ............3

*Мікалаева Л. В.* Погляд на маскоўска-літоўскія палітычныя канфлікты ў канцы XIV – першай палове XVI стагоддзя ў польскай гістарыяграфіі XIX стагоддзя ............ 16

*Олейник В. В.* Мемуарная литература как источник для исследований по истории органов военной юстиции последней трети XIX – начала XX веков ............ 22

*Чикалова И. Р.* Национальный вопрос в Габсбургской монархии в освещении российской историографии начала XX в. ............ 32

**РАЗДЕЛ 2. ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ИНСТИТУТЫ ИМПЕРИИ И РЕГИОНАЛЬНЫЕ ПОЛИТИЧЕСКИЕ ИНТЕРЕСЫ** ............ 45

*Кейко Ю. В.* Ведомственные нормативные правовые акты министерства государственных имуществ о строительстве православных храмов в конце 50-х гг. XIX в. ............ 45

*Киселев А. А.* Земская полиция белорусских губерний в период 1813–1825 гг. ............ 52

*Ляпешкін Я. М.* Службовыя паездкі мінскага губернатара А. Ф. Гірса і парадак яго замяшчэння (1912–1915 гг.) ... 62

**РАЗДЕЛ 3. ЭКОНОМИЧЕСКАЯ И СОЦИАЛЬНАЯ МОДЕРНИЗАЦИЯ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ** ... 74

*Алексашина Г. В.* Территориальное размещение наемных работников в городах Беларуси в конце XIX в. ... 74

*Волкава В. В.* Ваеннае лясное ўпраўленне Белавежа: структура адміністрацыі ... 86

*Жихарев С. Б.* Акционерное общество литовской железной дороги: экономические, правовые, финансовые и технические характеристики ... 93

*Моторова Н. С.* Основные тенденции развития помощи душевнобольным на территории белорусских губерний в 1861–1914 гг. ... 101

*Полетаева Н. И.* О численности и территориальном размещении предпринимателей в белорусских губерниях в конце XIX – начале XX в. ... 112

**РАЗДЕЛ 4. ТРАНСФОРМАЦИЯ ИДЕНТИЧНОСТЕЙ В ПРОЦЕССЕ СТАНОВЛЕНИЯ МОДЕРНЫХ НАЦИЙ** ... 121

*Дзярновіч А. І.* «Раны Сярэднявечча»: гістарычная праграма і мадэрнізацыйныя дыскурсы младалатышскага нацыянальнага руху 1850–1880-х гадоў ... 121

*Захаркевіч С. А.* Этнаграфія XIX ст. аб этнічных меншасцях Беларусі ... 133

*Мастяница-Станкевич О.* «В Литве: критический взгляд на литовскую интеллигенцию» (1910 г.) как источник смены женской идентичности ... 146

*Семергей Н. В.* Парадигма национального возрождения vs концепция модерных наций: дискуссии в новейшей украинской историографии ... 153

*Тихонова А. В.* Иностранцы в белорусских губерниях в 1820–1830-х гг. (по материалам деловой переписки генерал-губернатора) ... 162

*Шевкун П. В.* Формирование национальной идентичности в Беларуси (XIX – начало XX в.) ........ 176

*Шимукович С. Ф.* Научная элита родом из белорусских земель в российских университетах в «долгом XIX веке»: проблемы изучения и интерпретации ........ 192

**РАЗДЕЛ 5. КУЛЬТУРА ЭЛИТ И ПОВСЕДНЕВНОСТЬ НАСЕЛЕНИЯ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ** ........ 207

*Бусько С. И.* «Из варяг в греки»: плавание кадет полоцкого корпуса в Ригу как пример системы физического воспитания нового типа ........ 207

*Денисенко Е. П.* О сатирических журналах на идиш в Северо-Западном крае Российской империи ........ 214

*Козлов О. В.* Состояние сети начальных учебных заведений Витебской губернии на рубеже XIX–XX вв. ........ 223

*Ляневіч А. С.* Спорт і спартыўныя аб’яднанні ў жыцці дваранства расійскай імперыі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя ........ 233

# РАЗДЕЛ 4. ТРАНСФОРМАЦИЯ ИДЕНТИЧНОСТЕЙ В ПРОЦЕССЕ СТАНОВЛЕНИЯ МОДЕРНЫХ НАЦИЙ

*Дзярновіч А. І.*
Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск

*Dziarnovich A.*
Institute of History, NAS of Belarus, Minsk

**УДК 94(485)»18»**

## «РАНЫ СЯРЭДНЯВЕЧЧА»: ГІСТАРЫЧНАЯ ПРАГРАМА І МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫЯ ДЫСКУРСЫ МЛАДАЛАТЫШСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ 1850–1880-Х ГАДОЎ

## «THE WOUNDS OF THE MIDDLE AGES»: HISTORICAL PROGRAM AND MODERNIZATION DISCOURSES OF THE NEW LATVIANS NATIONAL MOVEMENT IN THE 1850–1880-IES

*Для латышоў у XIX ст. мадэрнізацыя была сінонімам стварэння нацыянальнай ідэнтычнасці. Ідэнтычнасць стваралася за кошт фармавання новых культурных асноў і латышскага літаратурнай мовы. У рамках младалатышскай гістарычна-культурнай праграмы 1850–1880-х гадоў быў сканструяваны міф «залатых часоў» данямецкай Латвіі; створаны «народны эпас» пра Лачплесіса. Але ў выніку рэалізацыі гэтай культурнай праграмы з нацыянальнай гісторыі латышоў была практычна элімінаваная гісторыя сярэднявечнай Лівоніі, перыяд*

pawet.net

*якой стаў разглядацца як «эпоха прыгнёту». Лівонія да канца так не была «вернутай» латышскай гісторыі нават у нашыя часы.*

*Ключавыя словы: Латвія; Остзейскія губерні; Расійская імперыя; XIX ст.; нацыяналізм; мадэрнізацыя; культурная палітыка.*

*Modernization for Latvians in the 19th century was synonymous with the creation of a national identity. The identity was created through the formation of new cultural elements and Latvian language. As part of the Young Latvians historical and cultural program in the 1850–1880-ies was constructed Golden era myth of Latvia before the Germans; it was created the Lāčplēsis «national epic». But as a result of the implementation of the cultural program of the national history of Latvians were almost displacing the history of medieval Livonia, the period of which has been regarded as the Era of oppression. Livonia to the end was never «returned» to Latvian history, even in our times.*

*Keywords: Latvia; the Baltic governorates; the Russian Empire; 19th c.; nationalism; modernization; cultural policy.*

Латышскае нацыянальны рух XIX ст. утрымлівала ў сабе значны мадэрнізацыйны імпульс. Фактычна, для латышоў мадэрнізацыя была сінонімам стварэння нацыянальнай ідэнтычнасці. Ідэнтычнасць стваралася за кошт фармавання новых культурных асноў і латышскага літаратурнай мовы. Культура і мова былі найважнейшымі сферамі праявы нацыяналізму. Перад латышскімі нацыяналістамі ў культурнай сферы стаяла задача стварэння нацыянальных культурных каштоўнасцяў, якія не саступалі б культурным дасягненням іншых народаў. Для латышоў народамі-супернікамі ў дадзеным выпадку былі немцы і рускія.

**Остзейскія губерні.** Остзейскімі губернямі, ці Остзейскім краем, у Расійскай імперыі пазначалі тэрыторыі Курляндскай, Ліфляндскай і Эстляндскай губерняў. Першыя тры чвэрці XIX ст. існавала і рэгіянальнае аб'яднанне гэтых губерняў у рамках генерал-губернатарства з цэнтрам у Рызе (1801–1878). Але і пасля скасавання гэтай адміністратыўнай структуры агульнасць лёсу Остзейскіх губерняў захоўвалася, што і выяўлялася ў назвах Остзейскі ці Прыбалтыйскі край. Такім чынам, Остзейскія губерні аб'ядноўвалі практычна ўсе эстонскія і латышскія тэрыторыі, за выключэннем Латгаліі – паўднёва-ўсходніх паветаў Латвіі, якія ўваходзілі ў Віцебскую губерню (1802–1917). Сама ж назва «Остзейскія губерні» паходзіць ад нямецкай назвы Балтыйскага мора – Ostsee.

У складзе Расійскай імперыі Остзейскія губерні валодалі асаблівым статусам. У аснове кіравання імі ляжала мясцовае заканадаўства («Збор

мясцовых ўзаканенняў губерняў остзейскіх»), паводле якога ўнутранае кіраванне краем ажыццяўлялася органамі самакіравання дваранства разам з урадавымі ўстановамі. Хоць сфера кампетэнцыі апошніх з канца XVIII ст. пашыралася, але ж і да пачатку Першай сусветнай вайны губернатар як прадстаўнік цэнтральнай улады быў вымушаны выбудоўваць сваю службовую дзейнасць такім чынам, каб не парушаць прывілеяў остзейскага дваранства [1, p. 73].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. Прыбалтыйскі край зведаў глыбокія змены ў сацыяльнай і нацыянальнай структурах. Адной з галоўных прычын гэтага быў інтэнсіўны рост капіталістычных адносін у краі і, адпаведна, урбанізацыйныя працэсы – колькасць жыхароў буйных гарадоў губерняў за кошт выхадцаў з вёскі няўхільна павялічвалася. Так, з 1867 па 1897 г. колькасць латышоў у Рызе вырасла з 23,5 % да 41,64 %, а эстонцаў у Рэвелі – з 51,8 % да 88,7 % [14, s. 80]. Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў сувязі з мілітарызацыяй эканомікі ўрбанізацыйныя працэсы толькі ўзмацніліся.

Але працэсы перасялення былых сялянаў у гарады зусім не азначала ліквідацыю аграрнай праблемы на вёсцы. Інтэнсіўнае развіццё капіталістычных, рынавых адносін адбывалася там таксама, што абвастрала праблему сялянскага малазямелля. На мяжы XIX–XX ст. у Эстляндскай губерні 73,9 % зямлі належала памешчыкам, сялянскія надзелы складалі 23,7 %, дзяржаўныя – 2,4 % зямельнага фонду. У Ліфляндскай губерні прапорцыі размеркавання зямлі выглядалі наступным чынам: 54,3 %, 34,8 %, 10,9 % адпаведна [6, с. 351]. І тут варта нагадаць, што памешчыкамі ў Остзейскім краі практычна цалкам былі немцы – нашчадкі ўладароў даўняй Лівоніі. А ў пачатку XX ст. карэннае насельніцтва краю (латышы і эстонцы) складалі агулам каля 85 % колькасці жыхароў, немцы – 6 %, рускія – 5 %.

Такім чынам, на зыходзе XIX і пачатку XX ст. Остзейскія губерні, перажываючы перыяд актыўнай мадэрнізацыі, усё яшчэ вельмі выразна адрозніваліся ад іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі паводле свайго гістарычнага лёсу, культуры, саслоўным ладзе, формах землеўладання і грамадзянскіх законаў.

**«Остзейскае пытанне».** Пад «Остзейскім пытаннем» у той час разумелі ўнутрыпалітычную праблему Расійскай імперыі, якая ўключала ў сябе ўзаемаадносіны цэнтральнай імперскай улады і галоўных суб'ектаў палітыка-прававога рэгулявання ў Остзейскіх губернях, найперш прывілеяванай нямецкай меншасці, а таксама карэнных

жыхароў краю (латышоў і эстонцаў) і расійскіх пасяленцаў. Такім чынам, «Остзейскае пытанне» – гэта праблема пераразмеркавання палітычных правоў і, адпаведна, рэалізацыя магчымасцяў на ўплыў жыцця краю.

Спецыфіка ідэалагічнага супрацьстаяння расійскіх славянафілаў з остзейскімі элітамі палягала ў тым, што нямецкія роды Прыбалтыкі былі адданымі і кваліфікаванымі функцыянерамі царскай адміністратыўнай сістэмы. Мясцовае прыбалтыйскае дваранства адкрыта заяўляла, што яны прымалі прысягу на вернасць імператару, а не Расійскай дзяржаве. Вядомы остзейскі публіцыст Г. Беркгольц адкрыта пісаў у 1860 г.: «Прыбалтыйскія немцы маюць усе падставы быць усёй душой за дынастыю, бо толькі абсалютная ўлада цара аберагае іх. Між тым, любая руская партыя, дэмакратычная, бюракратычная ці якая-небудзь іншая, зжарэ іх, ледзь толькі яна даб'ецца вырашальнай перавагі» [10, с. 58].

Толькі ўжо пры Александры II праблема нацыянальна-саслоўных кампетэнцый у Остзейскім краі выйшла на арэну публічнага абмеркавання. І тут расійскія славянафілы атрымалі даволі нечакана саюзнікаў у абліччы новапаўсталай інтэлігенцыі карэнных народаў Прыбалтыйскага краю.

Супрацоўнік рускага кансерватыўнага журналіста і рэдактара М. Н. Каткова латыш Крыш'яніс Валдемар змясціў у газеце «Московские ведомости» артыкул пад назвай «Хто кіруе Расіяй: самі рускія ці немцы?» [3, № 161]. У артыкуле былі прыведзены наступныя лічбы: сярод расійскіх міністраў – 15 % немцаў, сярод членаў Дзяржаўнага Савету – 25 %, сярод сенатараў – 40 %, генералаў – 50 %, губернатараў – 60 %. Каткоў, прачытаўшы артыкул перад здачай нумару газеты ў друк, не паверыў у гэтыя лічбы і загадаў свайму сакратару іх пераправерыць. Вынікі праверкі ўразілі Каткова яшчэ больш: сенатараў-немцаў апынулася нават больш – 63 % [5, с. 47–60].

«Остзейскае пытанне» як праблема ўзаемаадносін мясцовага (латышскага і эстонскага) насельніцтва Остзейскага губерняў Расійскай імперыі з нямецкім прывілеяваным насельніцтвам (дваранствам і верхнімі пластамі гараджанаў) і царскай адміністрацыі (рэгіянальнай і цэнтральнай) абвастрылася пад уплывам паўстання 1863 г. у Беларусі, Літве і Польшчы. У прыбалтыйскіх губернях адбывалася рэалізацыя «вялікіх рэформаў» і адначасовы рост нацыянальнай самасвядомасці карэнных народаў. Усе гэтыя працэсы выклікалі ажыўленую дыску-

сію ў публіцыстыцы і гістарыяграфіі рэгіёну. «Ахоўніцкая» стратэгія нямецкай гісторыка-прававой школы не змагла цалкам забяспечыць нязменнасць прывілеяванага становішча нямецкага насельніцтва («остзейскага ладу»). Пры гэтым уласна нямецкая гістарыяграфія Остзейскага краю дасягнула высокага прафесійнага ўзроўню. Латвійская гістарычная публіцыстыка гэтага перыяду мела прарасійскія тэндэнцыі. Расійская ж публіцыстыка і гістарыяграфія не змаглі выпрацаваць адэкватнай мадэлі апісання рэгіёну, які падаваўся непарушна расійскім [4, с. 37].

**Jaunlatvieši.** У сярэдзіне XIX ст. у Латвіі ўзнік латышскі нацыяналізм у класічнай для таго часу форме. Гэты новы нацыянальна ліберальны рух атрымаў назву младалатышскага, а яго прадстаўнікоў сталі называць младалатышамі (лат. jaunlatvieši). Першапачаткова гэты тэрмін выкарыстоўваўся ў скептычным значэнні з боку балтыйскіх немцаў, рэагуючы на палітычна-літаратурны рух «Маладая Германія».

Цэнтрам латышскага нацыянальнага руху на гэтым этапе сталі не этнічна латышскія землі (Курзэме і Відзэме), а таксама не шматэтнічная Рыга. Сістэматычная дзейнасць па фармуляванню пастулатаў латышскага нацыяналізму распачалася ў сталіцы Расійскай Імперыі, дзе на старонках выдання «Peterburgas Avizes» («Пецярбургская газета», 1862–1865 гг.) фармуляваліся асноўныя ідэалагічныя і палітычныя тэзы младалатышоў. Тлумачэнне гэтага феномену можна знайсці праз разуменне таго факту, што на тэрыторыі Латвіі ў сярэдзіне XIX ст. гарады не мелі этнічнай латышскай большасці, і ў гэтым сэнсе яны не былі латышскімі нацыянальнымі гарадамі. У такім выпадку цэнтрам нацыянальнага руху на раннім этапе гісторыі нацыяналізму мог стаць горад, які б знаходзіўся на па-за этнічнай тэрыторыі [11, с. 159–162]. Важна, каб у гэтым горадзе прысутнічала рэферэнтная група нацыянальнай інтэлігенцыі, схільнай да культурна-асветніцкай дзейнасці ў рамках парадыгмы нацыятварэння.

Найбольш выбітнымі прадстаўнікамі і ідэолагамі руху младалатышоў былі публіцыст і духоўны лідар младалатышоў Крыш'яніс Валдэмарс (Krišjānis Valdemārs), збіральнік дайнаў Крыш'яніс Баранс (Krišjānis Barons), паэт і рэдактар першай латышскай газеты «Peterburgas Avizes», стваральнік 500 латышскіх неалагізмаў Юрыс Алунанс (Juris Alunāns), мовазнавец і педагог Атыс Кронвалдс (Atis Kronvalds).

Младалатышскі рух быў рухам нацыяналістычным – нацыяналістычна латышскім, нацыяналістычна прарасійскім і нацыяналістычна

антынямецкім. Адстойваючы думку пра латышскі народ як самабытную этнічную супольнасць, младалатышы адмаўлялі ідэю балтыйскіх немцаў аб фармаванні нацыі на гістарычна-палітычнай аснове з паступовым зліццём нямецкіх, латышскіх і эстонскіх элементаў [2, с. 56]. Патрабаванні младалатышоў тычыліся толькі латышоў Відеме і Курземе; латгалы Віцебскай губерні не траплялі ў нацыянальную праграму младалатышоў. У гэты перыяд патрабаванняў ад уласнай дзяржавы не было.

Не жадаючы стаць ахвярамі германізацыі і ў перспектыве магчымай русіфікацыі, младалатышскія нацыяналісты разгарнулі каласальную дзейнасць на ніве развіцця латышскай мовы, нягледзячы на тое, што практычна ніхто з іх не меў спецыяльнай адукацыі і дастатковай навуковай падрыхтоўкі. Менавіта гэта збліжае латышскі рух з іншымі нацыянальнымі рухамі ў Расійскай імперыі, у якіх стваральнікі нацыянальных ідэнтычнасцяў пачыналі не з сістэматычнага вывучэння нацыянальнай гісторыі свайго народа, а з «культурна-антыкварнага дылетантызму» [7, с. 79].

У сваіх публіцыстычных творах ідэолагі младалатышскага руху вызначылі тэзы, прынцыповыя для нацыянальнага латышскага ўспрымання мінуўшчыны. Адным з падмуркаў латышскай візіі быў гістарычны міф пра «залаты век» данямецкай Латвіі. Ю. Алунанс наступным чынам апісваў гаспадарча-сацыяльны лад даўніх латышоў:

«...латышскія землі хутка разбагацелі, і суседнія народы захацелі падпарадкаваць іх сабе. Асабліва датчане і шведы імкнуліся да латышскіх земляў... але латышы, а асабліва куры, грозныя людзі, амаль заўсёды захоплівалі шведскіх і дацкіх жаўнераў жывымі і прадавалі ў палон да арабаў, якія за вялікія грошы куплялі моцных шведскіх і дацкіх мужыкоў ад рускіх перакупшчыкаў каля вусця Волгі. Дзякуючы гэтаму гандлю латышы атрымлівалі ад арабаў тонкія тканіны, каштоўныя камяні, золата і срэбра, ды ў такой колькасці, што багаццем сваім шырока праславіліся. Такім чынам, датчане і шведы, якія ў тыя часы сеялі паніку і жах па ўсёй Еўропе, сцерагліся і баяліся латышоў, а сярод іх асабліва кураў. Калі нават шведы і датчане нічога не маглі зрабіць супраць латышоў, то нам лёгка зразумець, што латышы не былі тады такім быдлам, як аўстралійскія або іншыя рабскія народы, якія цяпер, напэўна, вымруць пад еўрапейскім націскам, але былі больш адукаваныя, чым шведы і датчане, якія ў той час заснавалі так шмат дзяржаў» [12, lpp. 330–331; 7, с. 82].

Але як пры такім ваяўнічым характары старажытных латышоў іх змаглі заваяваць немцы? Алунас дае свой адказ: «Тое, што немцы змаглі перамагчы латышоў, адбылося дзякуючы разрозненасці апошніх, і яшчэ таму, што латышы не валодалі так добра ваенным мастацтвам, як немцы, якія заўсёды ваявалі і з італьянцамі, і з іншымі народамі» [12, lp. 331; 7, с. 82].

Вобразы «Старажытнай Латвіі» былі створаны ў сярэдзіне XIX ст., але атрымалі развіццё ў 1920–1930-я гг., а таксама ў другой палове 1980-х гг. Кожны з гэтых перыядаў стаў не проста фільтрам, але паслядоўным механізмам стварэння «Старажытнай Латвіі» як «месца памяці» латышскай этнанацыі. Створаны ў пэўным палітычным кантэксце гэты гістарычны міф (дакладней, асобныя яго элементы) укараніліся ў мастацтве, літаратуры, паўсядзённасці, стаўшы неадменнай часткай масавай гістарычнай памяці і важным атрыбутам латышскай нацыянальнай свядомасці [9, с. 138].

**Вобраз XIII ст. і эпас «Лачплесіч».** З канца XII ст. распачалася нямецкая каланізацыя і хрысціянізацыя паўднёва-ўсходняй Балтыі. Гэта найважнейшы і самы крытычны для латышскай нацыянальнай гісторыі перыяд. Менавіта падзеі XIII ст., адлюстраваныя ў народным эпасе, апісаныя і інтэрпрэтаваныя ў творах младалатышоў, а ў першай палове XX ст. прафесійнай гістарыяграфіяй, сталі асновай для ўсіх наступных эпохаў. Можна сцвярджаць – з вобразу «Трынаццатага стагоддзя» выцякае ўся нацыянальная гісторыя Латвіі, што прывяло да фармавання «міфу Трынаццатага стагоддзя» [9, с. 142]. У падмурках гэтага гістарычнага міфу ляжаць уяўленні аб супольнай бядзе, пачатку калектыўных пакутаў будучага латышскага народу – старажытных ліваў, латгалаў, селаў, земгалаў, куршаў. У цэлым гэтым плямёнам не ўдалося супрацьстаяць заваёўнікам, на працягу XIII ст. яны страцілі свабоду, пасля чаго наступіла 700 гадоў рабства. З гэтага кола ўяўленняў выцякае паэтычная метафара латышскага народу як «народа-сіраты», вымушанага, выжываючы, падпарадкоўвацца ўладзе чужынцаў. Адначасова ўзнікла і аўтаапалогія: хоць мы, латышы, і былі заваяванымі, пазбаўленыя ўлады на сваёй уласнай зямлі, але захавалі сваю сялянскую культуру і сваю мову [9, с. 143].

Латышскі міф пра XIII ст. быў у значнай ступені фундзіраваны гістарычнай паэмай Андрэйса Пумпурса «Лачплесіс». У перакладзе з латышскай Лачплесіс (Lāčplēsis) азначае «той, хто разрывае мядзведзя». Пумпурс стварaў гістарычна-паэтычнае палатно, якое мусілі заняць нішу латышскага гераічнага эпасу. Але ў адрозненні ад многіх падобных

праектаў у Цэнтральнай і Паўночнай Еўропе, Пумпурс ніколі не хаваў свайго аўтарства і таго, што «Лачплесіс» – гэта твор літаратуры. Тым не менш, было б памылкай усе вобразы і мастацкія прыёмы паэмы запісаць толькі на рахунак аўтара. Перад тым, як пайсці на ваенную службу, сын малазямельнага селяніна Ліфляндскай губерні Андрэй Індрыкавіч Пумпур (1841–1902) у 1867–1872 гг. адпрацаваў памочнікам каморніка і такім чынам меў магчымасць павандраваць па свайму краю, збіраючы народныя паданні. Гэта легенды пра затанулы замак, у якім захоўваюцца світкі, пакінутыя першапродкамі латышоў; легенды пра добрую фею Стабрадзе і пра стварэнне латышскай зямлі – далінаў і вялікай ракі Даўгавы.

Пасля 15 гадоў збіральніцкай і літаратурнай працы, у 1888 г., знаходзячыся на службе ў Расійскай імператарскай арміі ў чыне штабс-капітана, Пумпурс апублікаваў сваю гераічную паэму паводле матываў латышскай народнай творчасці. Вобраз галоўнага героя паэмы, Лачплесіса, увасабляе гераізм народа і сімвалізуе адвагу чалавека, які абараняе зямлю ад захопнікаў. Стварэнне падобных твораў многімі еўрапейскімі народамі, якія ў XIX ст. перажывалі перыяд нацыянальнага Адраджэння, ставіла сабе за мэту культываванне ў грамадстве гераічных нацыянальных легенд, якія б спрыялі ўмацаванню пачуцця нацыянальнай ідэнтычнасці сярод народных масаў.

І паэма «Лачплесіс» знайшла водгук сярод латышоў у якасці нацыянальнага эпасу. У Латвіі 22 лістапада адзначаецца як дзяржаўнае свята Дзень Лачплесіса – гэта дзень памяці герояў, якія палі за свабоду Латвіі. У 1919 г. у гэты дзень латвійскае войска адбіла наступ нямецка-белагвардзейскіх войскаў Бермондта-Авалава, якія наступалі на Рыгу. У той жа дзень была заснавана найвышэйшая ваенная ўзнагарода Латвіі – ваенны ордэн Лачплесіса. Праз сваю антыгерманскую скіраванасць паэма «Лачплесіс» і яе вобразы культываваліся не толькі ў міжваеннай незалежнай Латвійскай Рэспубліцы, але таксама і ў Савецкай Латвіі.

Эпас «Лачплесіс» падзяляецца на шэсць песняў: у першай апавядаецца пра латышскіх багоў, у другой і трэцяй – пра першыя подзвігі Лачплесіса, у чацвёртай – пра нямецкае заваяванне, у пятай – пра барацьба са злымі духамі, у шостай – непасрэдна пра барацьбу Лачплесіса з нямецкімі захопнікамі.

Пачаткі нямецкай каланізацыі былі апісаныя Пумпурсам у чацвёртай кнізе паэмы досыць драматычна [13, lpp. 200–201; 8, с. 124–125]:

| | |
|---|---|
| Rīdziņ' grīvā Daugavmalā | Там, дзе Рыдзіня ўпадала |
| Simtiem ļaudis strādāja: | У Даўгаву, там сотні людзей |
| Cirta, raka, sita, kala, | Рылі, палі забівалі, |
| Cēla jaunu pilsētu. | Новы горад будавалі, |
| Cietināja to ar valņiem, | Атачалі моцным валам. |
| Vidū domu būvēja, | Пасярэдзіне каменны |
| Velves, stabus, tumšus gaņģus, | Паўстаў сабор, пакрыты круглым |
| Viņai apkārt mūrēja; | І цяжкім купалам. |
| Pilsētu pie Rīdziņ-upes | Быў у Рыдзіні паўсталы |
| Rīgu arī nosauca. | Горад названы Рыгаю, |
| Rīgas domas tumšos mūros | Пад бранёй саборных чорных |
| Bīskaps Alberts valdīja, | Сцен біскуп Альберт там |
| Priesterus un bruņeniekus | Панаваў. Святароў і рыцараў |
| Tas pa zemēm sūtīja; | Рассылаў адтуль ён. |
| Mācīt, kristīt, laupīt, nokaut | Забіваць, хрысціць і рабаваць |
| Viņi visur iesāka. | Пачалі ў краіне яны. |

Аплотам чужынцаў стала Рыга, якая цяпер увасабляла ўвогуле горад, такі ментальна далёкі для латышоў:

| | |
|---|---|
| Ļaudis atzina par vēlu, | Людзі зразумелі, ды позна, |
| Ka tie bija pievilti. | Што яны ашуканыя, і апорай стала Рыга |
| Visiem svešiem uzbrucējiem | Чужынцаў і драпежнікаў. |
| Rīgā bija patversme, - | Ці не тады пра яе склалі |
| Ļaudis, Rīgas vārdu minot, | Песню гэтую горкую: |
| Noskumuši izsaucās: | |
| | |
| «Rīga, cik tu izlējusi | «Рыга, колькі ты забіла |
| Mūsu brāļu asinis! | Нашых юных сыноў! |
| Rīga, cik tu izspiedusi | Рыга, колькі спарадзіла |
| Vaimanas un asaras! | Ты рыданняў, стогнаў, слёз! |
| Rīga, cik tu postījusi | Рыга, колькі патравіла |
| Mūsu druvas, sējumus! | Ты зялёных нашых ніў! |
| Rīga, cik tu dedzinājʼsi | Рыга, колькі ты спаліла |
| Mūsu mājas, paspārnes! | Нашых гумнаў і хат! |
| Rīga, cik tu apēdusi | Рыга, колькі асушыла |
| Mūsu maizes tīrajas! | Бочак брагі ты! |
| Rīga, cik tu izdzērusi | Рыга, колькі вынішчыла |
| Mūsu miežu miestiņa! | Ты багацця нашага! |
| Rīga, cik tu aizvedusi | Рыга, колькі загубіла |
| Mūsu mantas laupītas! | Ты народу нашага! |
| Rīga, cik tu paņēmusi | Так скажы: чаго ж больш |
| Mūsu brāļiem brīvības! | Пажадаць магла б ты?» |
| Rīga, saki, – ko vēl vairāk | |
| Varētu tu kāroties?» | |

Тэма заваявання і ўсталявання чужынскага панавання, якое непасрэдна называецца рабствам, была працягнута Пумпурсам і ў шостай кнізе, найбольш гераічнай ва ўсёй паэме [13, lpp. 247–248: 8, с. 173–174]:

| | |
|---|---|
| Šeitan līvu zemes daļā | Паўсюль тут на землях ліваў, |
| Pilnīgi bij redzama | На хутарах, у вёсках, |
| Visās pilīs, visos ciemos | След нямецкі быў відочны |
| Vācu kungu valdība. | Прагнага ўладання. |
| Treknās druvās mieži, rudzi | Залаціліся, каласавалі |
| Zelta vārpām līgojās, | Ліваў нівы гладкія; |
| Līvi viņus ara, sēja, - | Лівы сеялі, а немцы |
| Svešie ņēma pļāvumu; | Бралі ўраджай сабе. |
| Trekni lopi, govis, vērši | На лугах пасвіліся каровы, |
| Zaļās pļavās ganījās, - | Цялушкі, авечкі тоўстыя; |
| Svešie viņu gaļu ēda, | Чужынцы іх мяса елі, |
| Viņu ādas pārdeva, | Прадавалі шкуры іх. |
| Pilīm blakus bija celtas | Пад абаронай замкаў цэрквы |
| Svešinieku baznīcas. | Крыжакоў павырасталі. |
| Priesteri un mūki viņās | У цэрквы тыя людзей зганялі |
| Ļaudis dzina, kristīja. | Немцы – і хрысцілі іх. |
| Kristītos par kalpiem sevim | У рабства ўсіх ахрышчаных ліваў |
| Svešinieki darīja | Навярнулі прышлыя, абклалі |
| Un no viņiem nodošanas | насельніцтва |
| Katrā gadā iedzina. | Цяжкімі паборамі. |
| Tie, kas vēl bij palikuši | Тыя ж, што верныя засталіся |
| Savā têvu ticībā, | Дзедаўскім багам сваім, |
| Izklīda pa dziļiem mežiem | Па глухіх лясах, па нетрах |
| Nezināmās silavās; | Непралазных хаваліся, |
| še tie cirta aklus mežus, | Высякалі, выпальвалі |
| Dedzināja līdumus, | Навіны запаветныя. |
| Iegrozīja jaunas mājas, | Будаваліся ў лясных трушчобах |
| Tēvu dieviem kalpoja. | І маліліся Пяруну. |
| Bet ir še tos uzmeklēja | Але і тут іх даганялі |
| Bruņenieku izlūki | Рыцараў выведнікі |
| Un, tiklīdz kā iedzīvojās, | І зноў іх абкладвалі |
| Nodošanas uzlika. | Непасільнай подаццю. |

Але старажытныя латышскія плямёны праяўляюць таксама волю да змагання. Іх вёў у бітву малады герой Лачплесіс, у якога шчырае сэрца і ён прагне справядлівасці [13, lpp. 246–247; 8, с. 172–173]:

| | |
|---|---|
| Turp, kur Gaujas krasti lokās<br>Dziļās gravās, ielejās,<br>Kur starp mežiem krastu līčos<br>Atrodas daudz pilskalnu,<br>Apdzīvotu latvju ciltīm,<br>Zemes vaļņiem apmestu,<br>Turpu devās kara pulki,<br>Vadīti no Lāčplēša;<br>Un, kur vien bij ieviesusies<br>Vācu sērga pilskalnos –<br>Ceļā tika izpostīti<br>Visi viņas perekļi. | Дзе ярамі лясными<br>Глыбока разарваныя<br>Гаўі берагі, там шмат<br>Узвышалася гарадзішчаў,<br>Абнесены насыпамі,<br>Равамі атачоных,<br>Населеных плямёнамі<br>Вольнымі латышскімі;<br>У тыя лясныя нетры войска<br>Лачплесіс рушыла,<br>І ўсюды, дзе асталяваліся<br>Выхадцы нямецкія<br>Нібы гнёзды змей, тыя замкі<br>Выпальваць начыста. |

Нягледзячы на ўвесь гераізм старажытных латышскім плямёнаў, агульная перамога была за нямецкімі каланістамі, рыцарствам і царквой. Пумпурс, выкарыстоўваючы сабраны фальклорны матэрыял, а таксама сюжэты з «Хроінікі Лівоніі» Генрыха Латвійскага, таксама ўвёў у паэму створаны ім вобраз Чорнага рыцара (Melnais bruņinieks), які ўвасабляў сабой спрадвечнага ворага латышоў і з якім змагаўся Лачплесіс. Гэтыя вобразы і топасы паэмы-эпасу «Лачплесіс» былі надзейна замацаваныя ў гістарычнай свядомасці латышскага народу.

У рамках младалатышскай гістарычна-культурнай праграмы быў сканструяваны міф «залатых часоў» данямецкай Латвіі; створаны «народны эпас» пра Лачплесіса; сфармулявана праграма балтызму (балцкай еднасці). Але ў выніку рэалізацыі гэтай культурнай праграмы з нацыянальнай гісторыі латышоў была практычна элімінаваная гісторыя сярэднявечнай Лівоніі, перыяд якой стаў разглядацца як «эпоха прыгнёту і рабства». Лівонія да канца так і не была «вернутаю» латышскай нацыянальнай свядомасці як частка ўласнай гісторыі нават у нашыя часы.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Андреева, Н. С.* «Остзейский вопрос» во внутренней политике российского правительства / Н. С. Андреева // Cahiers du Monde russe. – 2002. – 43/1, Janvier-mars 2002. – P. 67–102.

2. *Бутуліс, І.* Гісторыя Латвіі / І. Бутуліс, А. Зунда; пер. Я. Сурскага. – Мінск: Зміцер Колас, 2017. – 336 с.

3. *Валдемар, Х. М.* Кто правит Россией: сами русские или немцы? / Х. М. Валдемар // Московские ведомости. – 1869. – № 161.

4. *Дзярновіч, А. І.* «Остзейскае пытанне»: палеміка паміж расійскай і нямецкай публіцыстыкамі адносна гістарычнага лёсу Балтыйскіх правінцый у другой палове XIX ст. / А. І. Дзярновіч // Актуальные проблемы истории и культуры. Сб. науч. ст. – Вып. I : Европа: актуальные проблемы этнокультуры. – Минск: Беларуская навука, 2018. – С. 29–38.

5. *Инфантьев, Б.* Малоизвестные страницы жизни и деятельности Кришьяна Валдемара / Б. Инфантьев // Русский мир и Латвия: Три века русской культуры в Латвии. Памяти Б. Ф. Инфантьева. – Рига: Издание общества SEMINARIUM HORTUS HUMANITATIS, 2009. – С. 47–60.

6. История Эстонской ССР. – Таллин: Ээсти Раамат, 1966. – Т. 2. – 793 с.

7. *Кирчанов, М. В.* Zemnieki, latvieši, pilsoņi: идентичность, национализм и модернизация в Латвии / М. В. Кирчанов. – Воронеж: «Научная книга», 2009. – 204 с.

8. Лачплесис. Латышский эпос, воссозданный по народным преданиям. – Москва: Глав. ред. вост. лит-ры изд-ва «Наука», 1975. – 350 с.

9. *Рыжакова, С.* Historica Lettica: Национальная история и этническая идентичность. О конструировании и культурном реферировании прошлого латышей / С. Рыжакова – Москва: Ин-т этнологии и антропологии РАН, 2010. – 644 с.

10. *Сергеев, С.* «Хозяева» против «наемников». Русско-немецкое противостояние в императорской России / С. Сергеев // Вопросы национализма. – 2010. – № 3. – С. 38–78.

11. *Юхнёва, Н.* Роль Петербурга в национально-культурном развитии латышей и эстонцев (к вопросу о локализации центров национально-культурных движений вне основной этнической территории) / Н. Юхнёва // Проблемы этнической истории балтов. Тезисы докладов межреспубликанской научной конференции. – Рига, 1985. – С. 159–162.

12. *Alunans, J.* Raksti. Sak. R. Klaustiņš / J. Alunans. – Peterburga: A. Gulbja apgads, [1914]. – 2 daļa. – 421 lpp.

13. *Pumpurs, A.* Lāčplēsis: latvju tautas varonis. Tautas eposs. / Andrejs Pumpurs ; ar Jāzepa Rudzīša ievadapcerējumu un komentāriem. – Rīga: Zinātne, 1988. – 346, [1] lpp.

14. *Taube A v.* Die Deutschbalten – Schicksal und Erbe einer eigenständigen Gemeinschaft / A. Taube, E. Thomson, M. Garleff // Die Deutschbalten / Ed. W. Schlau. – München: Langen Müller, 1995. – S. 51–115.

**(Дата поступления: 26.11.2019).**